Аксана КАТОВІЧ,
старшы выкладчык кафедры рэжысуры
Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры і мастацтваў,
саіскальнік кафедры культуралогіі

# ФЕНАМЕНАЛОГІЯ КАНТЫНУУМА "ТРЫДЗЯВЯТАГА ЦАРСТВА" І ЎНІВЕРСУМУ ЛІНЕЙНАГА ЧАСУ Ў ТРАДЫЦЫЙНАЙ КУЛЬТУРЫ БЕЛАРУСАЎ

*Заканчэнне. Пачатак у № 12 за 2019 г.*

## РАДЗІННА-ХРЭСЬБІННЫЯ АБРАДЫ Ў ПРАСТОРЫ ЛІНЕЙНАГА ВЕКТАРА ЧАСУ

Аналіз першакрыніц, даследаванняў фалькларыстаў, этнографаў XIX–XX стст., уласных экспедыцыйных запісаў дазваляе зрабіць выснову: апісаны рытм мае ўніверсальны характар, таму што структуруе не толькі пахавальна-памінальны цыкл абрадаў, але і не менш складаныя па архітэктоніцы рытуальна-абрадавыя комплексы вяселля, радзін і хрэсьбінаў. Лінейны характар развіцця абрадавых падзей дае магчымасць сцвярджаць, што святы сямейна-родавай накіраванасці, з аднаго боку, цесным чынам звязаны з цыклічным гадавым колазваротам, а з другога – маюць сітуацыйны характар, які адлюстраваны ў прыказцы: *"Смерць і радзіны не выбіраюць гадзіны"*.

Высокім семіятычным статусам было надзелена нараджэнне дзіцяці, якое станавілася своеасаблівай кропкай адліку новага абрадавага часу ў сям'і. Пры гэтым неабходна акцэнтаваць увагу на важнай этнакультурнай акалічнасці: асноўныя ўдзельнікі абрадавых падзей (перш за ўсё парадзіха і бабка-павітуха) заставаліся ў духоўным полі гадавога святочнага календара, але дадаткова да яго ўключаліся ў сістэму дзеяння яшчэ аднаго часавага вымярэння, уводзілі новую, быццам бы паралельную шкалу, дзе захоўваўся той самы ўніверсальны рытм часавай арганізацыі: 0–3–9–40–1 год. Аднак пры ўсім відавочным надкаляндарным разгортванні лінейнага вектара радзін трэба засведчыць, што, так бы мовіць, каляндарны фон быў цесна з ім знітаваны. Увесь рэгламентацыйны масіў традыцыйных уяўленняў імгненна ўключаўся ў поле часавай прымеркаванасці дня нараджэння.

Па ўяўленнях беларусаў, момант нараджэння дзіцяці меў лёсавызначальны характар. Перш за ўсё ён цесна суадносіўся са шматлікімі фактарамі ўласна касмічнага кшталту: *"...хто родзіцца ўзімку... на такіх людзях і свет трымаецца; ...улетку, будзе вельмі гарачы да сярдзіты; марцовыя дзеці не бываюць сталымі людзьмі...; маёвыя дзеці самыя нешчаслівыя...; ...па восені... та будзе багато жыць"* [20, с. 173–174]; *"увосень і верабей піва варыць – багатае будзе дзіця"*; *"калі народзіцца на растучую луну – то добра"**; *"калі дзіця радзіласо ў часе ат поўначы да паўдня, та яно будзе ўдалае, а калі после паўдня ці пад вечар пры заходзе сонца, та з яго нічого добраго не будзе. Калі яно й выгадуецца, та будзе нехлямяжым"* [20, с. 171]; *«раніцай дзень нараджаецца і рабёнку лепш, як свет, а пад поўнач, кажуць: "Ай, пад поўнач нарадзіўся, нядобра"»***; *"панядзелак лічыцца нешчаслівым... хто родзіцца ў гэты дзень, та будзе гультаяватым... Хто родзіцца ў нядзельку, той будзе самы шчаслівы"* [20, с. 173].

Фактар часавай прымеркаванасці дапаўняўся шэрагам фізіялагічных акалічнасцей, якія, лічылася, таксама прадказвалі асаблівасці нованароджанага: недаўгавечнасць, *"калі дзіця нараджаецца відам... ўніз"*; *"калі яно маўчыць і спакойнае"*; знак "шчасця" атрымлівала дзіця, *"да не толькі ён сам, але й уся сям'я"*, якое *"раджаецца ў чапцы, ці як жэ кажуць, у сарочцы... Кажуць, што такая матчына сарочка перасцеражэ ад хваробы, непрыяцеля і дае вялікае шчасце ва ўсю жытку"* [20, с. 171–172]. Спектр прыродна-біялагічных маркёраў дапаўняўся некаторымі сацыякультурнымі фактарамі асэнсавання часу: *"як ў сям'і мярцвец, та тое дзіця не даўгавечнае"* [20, с. 171]. Гэты прыклад, з аднаго боку, яшчэ раз пераканаўча даказвае надзвычайны статус пахавальнага абраду, які спыняў сакральны абрадавы каляндар і разам з тым негатыўна ўздзейнічаў на лёс чалавека, чыё нараджэнне супадала з часам смерці каго-небудзь з суродзічаў. А з іншага боку – выразна праяўлялася карціна надкаляндарнай траекторыі разгортвання двух абрадавых комплексаў,

---

* Запісана ад Марыі Іванаўны Станкевіч, 1934 г. н., з вёскі Вялікія Поўсвежы Лепельскага раёна.

** Запісана ад Аляксандры Іванаўны Рудзёнак, 1934 г. н., з вёскі Матырына Ушацкага раёна.

РЭПАЗІТОРЫЙ БГУКИ

пры гэтым прасочвалася цесная ўзаемасувязь паміж імі.

Па гэтых маркёрах людзі, якія валодалі пэўнымі ведамі (бабкі-павітухі, знахаркі), маглі прадказаць лёс дзіцяці, у народзе казалі: *"На раду напісана..."* Калі ж павітуху нешта не задавальняла, яна магла звярнуцца да рытуальна-магічных дзеянняў, каб хоць неяк "падкарэктаваць" асобныя прадказальныя моманты: *"баба стараецца перарэзаць яму пупавіну на ксёнжцы, каб было разумнае"*; *"прымае дзіця не голымі рукамі, а пакрыўшы іх якою-небудзь старызнаю, каб дзіця ніколі не было голае, а заўжды жыло ў багацстве"* [20, с. 170].

У адпаведнасці з традыцыйнымі ўяўленнямі беларусаў першыя тры дні пасля нараджэння дзіцяці былі асабліва важнымі: Бог *"едзець, долечку нясецъ гэтаму дзіцяці, гэтаму маленькаму. І хлебавую, і грашавую, і тую вянчальную"*; *"– Судзі, Божа, майму дзіцяці да хросту, / – Ад хросту судзі, Божа, да вянца, / Да ад вянца судзі, Божа, да жыцця"* [18, с. 21–22].

Зусім невыпадкова, што першыя тры дні ў кантэксце сямейна-родавых абрадаў былі строга рэгламентаваны: вяселле з'яўлялася тым момантам, калі дзяўчына і хлопец пераходзілі ў іншы стан суіснавання, абрад пахавання быў арыентаваны на "пераход" чалавека з царства зямнога ў нябеснае. Нараджэнне дзіцяці – той самы "пераход" з чэрава маці да жыцця ў зусім новым свеце. Таму на працягу трох дзён у сям'і неабходна было падтрымліваць сітуацыю стабільнасці: *"Як родзіцца дзіця, першыя тры дні не можна пазычаць людзям нічога з хаты, асабліва агню, бо дзіця як падрасце, та будзе цурацца свае хаты да можэ зрабіцца спрэс валацугаю"* [20, с. 176; 7, с. 111]. Тут да месца будзе згадаць казку "Аддай мне тое, што ў доме невядома", дзе купец за сваё выратаванне аддаў сына (!), пра нараджэнне якога не ведаў.

Сістэму сямейна-родавых абмежаванняў, звязаную з лімінальнымі абрадамі, дапаўняюць забароны, што тычацца розных аспектаў вядзення гаспадаркі: *"Як ацеліцца карова ці ажарэбіцца кабыла, ці якая іншая худобіна, та той дзень нічога не прадаюць, не даюць і не пазычаюць нікому, каб жыўёло не худзело"* [20, с. 77]. Было вельмі непажадана, каб на працягу трох дзён з таго моманту, як купілі парасят, у двор прыходзілі чужыя людзі*.

У гэтыя тры дні адбываліся падзеі, якія мелі рытуальную накіраванасць і павінны былі ўплываць на далейшае жыццё нованароджанага: яго першы раз спавівалі, кармілі, купалі, клалі ў калыску і г. д. У аснове першапачатковых дзеянняў, скіраваных на немаўля, была магія "пачатку" і сімволікі правага і левага: *"калі матка першы раз дасць сваймy дзіцяці левую цыцку, та ў яго будуць ліхія вочы"* [20, с. 175, 181]; *"будзе леўшаком"* [7, с. 134]. "Па традыцыі, якая існавала ў канцы XIX – пачатку XX ст., бабка-павітуха наведвала парадзіху ў першыя тры дні пасля родаў: купала дзіця, дапамагала па гаспадарцы, насіла ежу", – адзначае Т. Кухаронак [14, с. 47]; *"завеш гэту бабку, калі дома ражаем, значыць, на 3 дзень"***. У радзіннай песні так вызначалі ролю бабкі-павітухі: *"Бабулечка на куце села, / Бабулечка песню запела: / А первую – ды радженую, / А другую – ды суджоную, / А трэцюю – хрэсьбінскую"* [18, с. 206].

Доказам "закрытасці" сям'і на працягу першых трох дзён з'яўляецца забарона жанчынам прыходзіць у гэты час у адведкі: *"Як толькі пройдзе тры дні пасля родаў, сваячкі і суседкі ідуць да радзіхі ў провідкі"* [7, с. 111].

У першыя дні пасля нараджэння (часцей за ўсё на дзявяты дзень) выконваўся абрад першага рытуальнага купання дзіцяці (першага, таму што пасля смерці выконвалася апошняе рытуальнае купанне, якое скіравана на тое, каб "змыць" з чалавека сляды яго зямнога існавання [7, с. 261; 14, с. 34–35]). Купанне было арыентавана на тое, каб "запраграмаваць" перспектывы будучага жыцця. З гэтай мэтай у ваду клалі спецыяльныя прадметы: "...на Палессі звычайна соль і асвячоныя травы, у іншых месцах – сярэбраную манету, каб дзіця вырасла чыстае, як срэбра, здаровае і багатае; ...асвячоную на Іярдане ваду... каб засцерагчы ў будучым ад злых вачэй..." [7, с. 105; 14, с. 34–35; 20, с. 172].

Да саракавога дня дзіця хрысцілі і давалі імя: *"Храсціць дзіцятка найлепш, як споўніцца 6 нядзель, або да таго, як уводзімся, 40 дзён"****. На саракавы дзень выконваўся абрад уцаркаўлення (уводзін) маці – умоўнае "вяртанне" ва ўлонне царквы [11, с. 11–12, 15]. Тут мы бачым даволі істотны ўплыў хрысціянскай традыцыі, якая расставіла свае часавыя акцэнты. "Па меры ўмацавання хрысціянства абрады, якія раней адносіліся да дня з'яўлення дзіцяці на свет, былі перанесены на дзень хрышчэння. Дзеянні, што выконваліся над дзіцем у гэтыя дні, уплывалі на яго дзяцінства, юнацтва і нават на ўсё яго жыц-

* Запісана ад Галіны Іванаўны Качэрскай, 1931 г. н., з вёскі Згурск Чэрвеньскага раёна (нар. у вёсцы Пнявічы таго ж раёна).

** Запісана ад Івана Адамавіча, 1936 г. н., і Марыі Іванаўны, 1939 г. н., Салановічаў з вёскі Любонічы Кіраўскага раёна.

*** Запісана ад Ніны Сяргееўны Чыжонак, 1936 г. н., з вёскі Любонічы Кіраўскага раёна.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

цё", – сцвярджае П. Багатыроў [1, с. 89–90]. Думаецца, што гаворка ідзе найперш пра імя, якое раней давалі ў момант першага купання дзіцяці [14, с. 41]. Па меркаваннях нашых продкаў, пакуль дзіця не пахрысцяць, яно не мае свайго "ахоўніка", таму яго не паказвалі чужым, не выносілі на вуліцу; у некаторых месцах маці нават забаранялася карміць нехрышчонае дзіця [8, с. 664–666].

Неабходна адзначыць, што нараджэнне дзіцяці станавілася знакавай падзеяй не толькі для сям'і, але і для ўсяго вясковага соцыуму. Пачыналі актуалізавацца міжродавыя сацыяльныя сувязі: трэба было выбраць хросных бацькоў, запрасіць родных і сваякоў і г. д. Аднак беларускае звычаёвае права сведчыць і пра больш завуаляваныя ўзаемаадносіны. Напрыклад, калі дзіця нарадзілася па-за межамі сваёй вёскі, яго неабходна было спачатку пахрысціць, а потым несці ў родную хату, інакш *"сем лет неўраджай будзе ў том сяле"* [7, с. 117]; нованароджаны мог дапамагчы дзяўчатам, якія не маглі выйсці замуж: трэба было стаць хроснай для байстручка, і "як хрэснік пачне хадзіць", яна будзе святкаваць сваё вяселле [20, с. 178].

На працягу першага года жыцця дзіця станавілася цэнтрам сусвету, вакол якога фарміравалася значная колькасць абмежаванняў, патрабаванняў, перасцярог і прадпісанняў. Малое аказвалася ў полі ўздзеяння вялікага пласта фальклору, які спрыяў яго фізічнаму і разумоваму фарміраванню. Калыханкі, пястушкі, забаўлянкі былі скіраваны на тое, каб немаўля спасцігала навакольнае асяроддзе і родную мову: *"Люлі, люлі, люлі, / Пайшоў кот на гулі, / Палез на палаткі, / Украў дзве аладкі"**.

Любая падзея ў жыцці нованароджанага ўспрымалася як урачысты акт, які суправаджаўся спецыяльнымі рытуальнымі дзеяннямі: першы самастойны крок – "перарэзваннем путаў" [14, с. 84]; з'яўленне і выпадзенне першага зуба – "зваротам да мышкі" [20, с. 183] і інш. На працягу першага года дзіцяці не стрыглі валасы, "каб не застрыгчы мову і памяць" [14, с. 90]; "каб не балелі вочкі"; нельга "...падносіць дзіця к люстэрку ці к вадзе, каб яно не ўбачыла там сябе" [20, с. 183].

Роўна ў год праводзілі абрад першага пастрыжэння, а валасы пасля яго клалі за бажніцу і захоўвалі на працягу ўсяго жыцця; раілі, каб дзіця было ахвотнае да працы, "першую работу" ўкласці ў рукі ў той дзень, у які яно нарадзілася [20, с. 185; 14, с. 90–91].

*Запісана ад Марыі Іванаўны Саланові́ч, 1939 г. н., з вёскі Любонічы Кіраўскага раёна.

## РЫТУАЛЬНА-АБРАДАВЫ КОМПЛЕКС ВЯСЕЛЛЯ Ў ПРАСТОРЫ ЎНІВЕРСАЛЬНАГА ЛІНЕЙНАГА ВЕКТАРА ЧАСУ

Нашы продкі верылі, што з'яўленне чалавека на свет – гэта вырашэнне Нябёсаў, таму народнае выслоўе зафіксавала асноўныя вехі жыцця чалавека наступным чынам: *"Радзіны, вяселле й смерць, гэто самае важнае ў жыццю чалавека. Радзіны кожны пераджыў, а смерць не міне, а вяселле – як Бог судзіць"* [20, с. 197]. У сістэме складаных узаемаадносін паміж каляндарнымі і сямейна-абрадавымі комплексамі склалася пэўная карціна стасункаў: пахавальны абрад адмяняў сістэму каляндарных святкаванняў, выключаў сям'ю з цыкла сакральных традыцыйных практык; радзінна-хрэсьбінны абрад уключаўся ў сістэму каляндарных адносін праз год пасля нараджэння чалавека. А вось вясельны абрад прыстасоўваўся да рытмаў каляндарных падзей (дату вяселля трэба было дакладна вызначаць, падпарадкоўваючыся разгорнутай сістэме сацыякультурных рэгламентацый, якія аб'ядноўвалі і дахрысціянскія, і хрысціянскія этнакультурныя каштоўнасці).

Абрадавая структура перадвясельнага перыяду, часу правядзення самога вяселля і паслявясельных падзей сведчыць пра тое, што і яна суадносіцца з універсальным рытмам традыцыйнай культуры. Кропкай адліку вяселля можна было б лічыць дзень сватаўства. У славян найбольш удалымі ўспрымаліся "мужчынскія" дні – аўторак і чацвер, у назвах якіх зашыфравана парнасць (другі і чацвёрты), што з'яўляецца сімвалічнай дамінантай у змесце найбольшай колькасці вясельных абрадаў [7, с. 189]; *"Якраз у гэтую пару* (паміж Пакровамі і першай нядзеляй Піліпаўскага посту. – ***А. К.***) *дзяўчаты, якія думаюць аб сваёй долі, бываюць асабліва рухавыя і неспакойныя: апрача таго, што яны больш старанна, чым у іншы час, уходжваюцца каля дому, мусяць асаблівую ўвагу звяртаць на чысціню і ахайнасць; асабліва яны стараюцца ў чацвер і суботу, дні, у якія звычайна прыязджае сват"* (Барысаўскі, Полацкі раёны) [3, с. 39; 522]; *"Выпіўшы і закусіўшы ў доме жаніха, сваты звычайна пад вечар перад нядзеляю або святочным днём адпраўляюцца ў дом нявесты"* (Мінскі, Гомельскі раёны) [3, с. 215].

Немалаважная акалічнасць – час сутак. Па ўяўленнях нашых продкаў, *"у сваты ідуць звычайна вечарам і прытым у суботу"* (Ашмянскі раён) [3, с. 260]; *"Ехаць у сваты імкнуліся непрыкметна, часцей за ўсё цёмначы – каб аднавяскоўцы не надта ведалі пра сватанне: а раптам нявеста адмовіць"* (Полацкі раён) [3, с. 522]. Услед за сватаўствам прызначалі *правед-*

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

*кі, пярэпыты, змовіны, запоіны* і іншыя сустрэчы двух бакоў.

Вырашальным днём перадвясельнага перыяду была зборная субота (завівалі вянок, пастрыгалі жаніха і нявесту, садзілі на пасад): *"Зборная суботка настала, / Марыська дзевачак збірала..."* [3, с. 192]. Асноўным свяшчэннадзействам гэтага часу было выпяканне каравая – сімвала сямейнага шчасця: *"Ляцелі птушачкі з раю, / Пыталіся ў караваю: / – Ці ўжо каравай учынялі, / Чаму нас, птушачак, не ждалі? / Мы б таму часу прыбылі, / Шчасцедолю прынеслі, / Шчаслівую гадзіну / Нашаму сужаньку-чалядзіну*; *"Караваю, мой раю, / Вяселле пачынаю. / З шчасцею і з доляю, / Шчаслівай гадзінаю. / Шчаслівай гадзінаю, / З вялікай дружынаю"* [4, с. 61; 68–69]. Каравай выпякалі напярэдадні вяселля, звычайна ў суботу, у Пружанскім раёне непасрэдна ў дзень вянчання – у нядзелю [3, с. 132]; у Ваўкавыскім, Лепельскім раёнах – у чацвер: *"Калі ў той дзень, як пякуць каравай, да не будзе відаць сонейка, то й жытка маладых будзе нярадасная, а калі ясна засвеціць сонейка, то й жытка будзе ясная, радасная"*; у пахмурны дзень *"каб жыццё маладых не было цяжко, пасупно"*, чакалі, каб на хвілінку выглянула сонейка, і тады пачыналі мясіць цеста для каравая [7, с. 221].

Абавязковая ўмова ў прызначэнні дня таго ці іншага вясельнага абраду – "абмінуць" дзень смерці і нараджэння: не ішлі сватацца ў той дзень тыдня, у які памёр нехта са сваякоў дзяўчыны, *"бо з таго не будзе ладу, а калі й будзе, та жытка маладых будзе недаўгавечная й нешчаслівая"* [20, с. 198]; *"...калі хтосьці з маладых прыйшоў у чацвер на свет, звычай патрабуе рашчыняць каравай на дзень раней, г. зн. у сераду (радзей у пятніцу), пра што заўсёды памятаюць"* [7, с. 221; 3, с. 128].

Само вяселле доўжылася тры дні: *"Прапіла маці дочку / На салодкім мядочку. / Не за год згадавала, / А за тры дні прагуляла"* [4, с. 89]; *"Вяселле пачыналася са збора дружыны, звычайна ў суботу, а яшчэ даўней – у нядзелю, і доўжылася два-тры дні"* [24, с. 244, 302]; *"Вяселле ў нас адбываецца дзён чатыры-п'яць. Больш усяго пачынаючы з п'ятніцы да аж да серады на другом тыдні"* [20, с. 203]; *"Сапраўднае вяселле, бывала, начынаецца ў нядзелю, а потым панядзелак і аўтарак гуляюць, значыцца тры дні. А цяпер ўжо гуляюць у суботу і ў нядзелю"**.

У нядзелю наступнага тыдня (прыблізна на дзявяты дзень пасля вяселля) у хаце маладой спраўлялі *пярэзвы* (*пірагі, пірязоў, перазыўкі, прыгасці*): «*бацькі маладога едуць да бацькоў маладой і святкуюць "сваё" вяселле*» [25, с. 375]. Сімвалічным быў гэты дзень і для нявесты – дачка прыходзіла да маці апошні раз, таму што з гэтага моманту пачыналася яе новае жыццё ў сям'і мужа і далей прыходзіць у бацькоўскую хату яна зможа толькі ў вызначаныя дні: *"Ну, вось гладзі, дачушачка, ужо ты к нам ніяк не прылепешся, ну, вось гладзі, як не ляпі гэты хлеб, ніяк не прылепліваецца, адрэзаны..."***.

Роўна месяц (пачынаючы ад *пярэзваў*, а г. зн. прыкладана да саракавога дня ад пачатку вяселля) доўжыўся той тэрмін, які ў народзе назвалі *мядовым*. Да года ў маладой сям'і з'яўляўся прадаўжальнік роду – першае дзіця. Развіццё эмбрыёна чалавека таксама працягваецца дзевяць месяцаў, або сорак тыдняў.

Наступленне смерці чалавека прадказваў шэраг з'яў і акалічнасцей, момант нараджэння чалавека распавядаў пра яго лёс, характар, здольнасці і магчымасці. Час вяселля таксама меў свае перадумовы. Па-першае – варажба на *Каляды*, *Купалле* і іншыя святы, па-другое – рытуальна-абрадавыя дзеянні сацыяльнага характару (на Каляды выкананне абраду "Жаніцьба Цярэшкі", на Тройцу – кумленне і інш.). Па-трэцяе – выкананне / невыкананне рэгламентацый і забарон, якія маглі ўплываць на лёс дзяўчыны або хлопца. Ва ўсе часы бясшлюбнасць лічылася вялікім сорамам як для нежанатай моладзі, так і для іх бацькоў. Адсюль столькі абрадавых (напрыклад, "Калодкі" на Масленічным тыдні) і пазаабрадавых дзеянняў (кпінаў, праклёнаў, брыдкіх слоў) з боку сялянскай абшчыны, скіраваных да нежанатай моладзі. Пад страхам не выйсці замуж / ажаніцца і стварыць сям'ю забаранялася: сядзець на парозе тварам на двор [5, с. 147]; сядзець на калодцы, на якой дровы сякуць, *"пакуль калодка не рассыплецца, патуль той не будзе пары"* [20, с. 194]; месці хату, займацца ткацтвам па пятніцах і святочных днях і інш. Людзей, якія не ўступілі ў шлюб, не стварылі сям'і, не прадоўжылі свой род, не дапускалі да выканання абрадавых дзеянняў як каляндарнага цыкла, так і сямейна-родавай накіраванасці: "...іх не пасылаюць сватаць, не клічуць выпякаць вясельны каравай і інш." [5, с. 147–148].

Калі прыняць за аснову, што міфапаэтычная спадчына славянскіх народаў адлюстроўвала гарманічнае суіснаванне чалавека ў прыродным асяроддзі, то, безумоўна, стрыжань структурнай упарадкаванасці неабходна шукаць у ма-

* Запісана ад Марыі Іванаўны Салановіч, 1939 г. н., з вёскі Любонічы Кіраўскага раёна.

** Запісана ад Марыі Іванаўны Станкевіч, 1934 г. н., з вёскі Вялікія Поўсвежы Лепельскага раёна.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

дэлі свету. Казачнае "*тры-дзявятае царства*" ёсць не што іншае, як поўны цыкл фаз Месяца (3×9=27), а працяг гэтай структуры звязаны з цыклічнасцю Сонца (9×40=360). Практычна ўсе рытуальна-абрадавыя комплексы сямейна-родавай накіраванасці, якія разгортваліся ў адпаведнасці з лінейным вектарам часу, так ці інакш былі звязаны з іерафаніяй Месяца і Сонца.

Такім чынам, у беларускай этнакультурнай традыцыі лінейны вектар структуравання часу быў пакладзены ў аснову фарміравання найважнейшых рытуальна-абрадавых комплексаў сямейна-родавай накіраванасці. У сувязі з тым, што ён структуруе архітэктоніку пэўных святочна-абрадавых цыклаў, мы маем усе падставы назваць яго ўніверсальным: 0–3–9–40–1 год. Адзначым найважнейшую акалічнасць, якая да гэтага не разглядалася філосафамі культуры і культуролагамі, – характар узаемасуаднесенасці лінейнага вектара часу і закальцаванасці цыклічнага часу ў каляндарным колазвароце. Пахавальна-памінальны вектар разгортвання лінейнага часу адмяняў дзейнасць святочнага календара (пра што вельмі пераканаўча сведчаць чарадзейныя казкі). Рытуальна-абрадавы комплекс вяселля, наадварот, строга падпарадкоўваўся нарматыўна-рэгламентавальнай базе звычаёвага права традыцыйнага календара. Радзінна-хрэсьбінны комплекс напластоўваўся на падзеі народна-праваслаўнага календара, утвараючы ў ім у межах сям'і дадатковыя кропкі актуалізацыі сакральнага часу ва ўсе наступныя дні нараджэнняў.

### Спіс літаратуры


1. **Богатырёв, П. Г.** Народная культура славян / П. Г. Богатырёв ; сост. Е. С. Новик, Б. С. Долгин ; ред. Е. С. Новик. – М. : ОГИ, 2007. – 368 с.
2. **Выслоўі** / склад., сістэм. тэкст., уступ. арт. і камент. М. Я. Грынблата. – Мінск : Навука і тэхніка, 1979. – 520 с.
3. **Вяселле** : Абрад / уклад., уступ. арт. і камент. К. А. Цвіркі. – Мінск : Навука і тэхніка, 1978. – 640 с.
4. **Вяселле. Песні** : у 6 кн. / склад. Л. А. Малаш ; муз дадат. З. Я. Мажэйка ; рэд. М. Я. Грынблат, А. С. Фядосік. – Мінск : Навука і тэхніка, 1980. – Кн. 1. – 680 с.
5. **Гура, А. В.** Безбрачие / А. В. Гура // Славянские древности : этнолингвистический словарь : в 5 т. / под общей ред. Н. И. Толстого. – М. : Междун. отношения, 1995. – Т. 1. – С. 147–148.
6. **Гуц, А. К.** Элементы теории времени / А. К. Гуц. – Омск : Наследие. Диалог-Сибирь, 2004. – 364 с.
7. **Жыцця адвечны лад** : беларускія народныя прыкметы і павер'і / уклад., прадм. і пер. У. Васілевіч. – Мінск : Маст. літ., 1998. – Кн. 2. – 607 с.
8. **Кабакова, Г. И.** Крещение / Г. И. Кабакова // Славянские древности : этнолингвистический словарь : в 5 т. / под общей ред. Н. И. Толстого. – М. : Междун. отношения, 1999. – Т. 2. – С. 664–667.
9. **Косарев, М. Ф.** Основы языческого миропонимания : по сибирским археолого-этнографическим материалам / М. Ф. Косарев. – М. : Ладога-100, 2000. – 352 с.
10. **Котович, О. В.** Белорусская свадьба в пространстве традиционной культуры / О. Котович, Я. Крук. – Минск : Адукацыя і выхаванне, 2012. – 848 с.
11. **Крещение. Венчание. Погребение. Посты** (Наши традиции). – М. : Букмен, 1998. – 384 с.
12. **Крук, Я.** Сімволіка беларускай народнай культуры / Я. Крук. – Мінск : Беларусь, 2011. – 430 с.
13. **Культурология. XX век** : словарь / гл. ред., сост. и автор проекта А. Я. Левит. – СПб. : Университетская книга, 1997. – 630 с.
14. **Кухаронак, Т. І.** Радзінныя звычаі і абрады беларусаў : Канец XIX–XX ст. / Т. І. Кухаронак. – Мінск : Навука і тэхніка, 1993. – 126 с.
15. **Лоеўшчына... Бэзавы рай, песенны край** : Сучасны стан традыцыйнай культуры Лоеўшчыны / уклад., сістэм., тэкст. праца В. С. Новак. – Гомель : Сож, 2007. – 472 с.
16. **Народная духоўная спадчына Гомельскага раёна** / уклад. сістэм., тэкст. праца і рэд. В. С. Новак. – Гомель : ААТ Полеспечать, 2007. – 456 с.
17. **Пропп, В. Я.** Исторические корни волшебной сказки / П. Я. Пропп. – М. : Изд-во Ленинград. гос. ордена Ленина ун-та, 1946. – 340 с.
18. **Радзіны** : Абрад. Песні / уклад. і сістэм. тэкстаў Г. А. Пятроўскай, апісанне абрадаў Т. І. Кухаронак, уступ. арт. і камент. Г. А. Пятроўскай, Г. В. Таўлай, Т. І. Кухаронак ; рэдкал : А. С. Фядосік [і інш.]. – Мінск : Беларус. навука, 1998. – 637 с.
19. **Сержпутоўскі, А. К.** Казкі і апавяданні беларусаў-палешукоў / А. К. Сержпутоўскі. – Мінск : Універсітэцкае, 1999. – 191 с.
20. **Сержпутоўскі, А. К.** Прымхі і забабоны беларусаў-палешукоў / А. К. Сержпутоўскі. – Мінск : Універсітэцкае, 1998. – 301 с.
21. **Толстая, С. М.** Время / С. М. Толстая // Славянские древности : этнолингвистический словарь : в 5 т. / под общей ред. Н. И. Толстого. – М. : Междун. отношения, 1995. – Т. 1. – С. 449–452.
22. **Толстая, С. М.** Полесский народный календарь / С. М. Толстая. – М. : Индрик, 2000. – 600 с.
23. **Толстая, С. М.** Поминки / С. М. Толстая // Славянские древности : этнолингвистический словарь : в 5 т. / под общей ред. Н. И. Толстого. – М. : Междун. отношения, 2009. – Т. 4. – С. 162–169.
24. **Традыцыйная мастацкая культура беларусаў** : у 6 т. / Т. Б. Варфаламеева, В. І. Басько, М. А. Козенка [і інш.]. – Мінск : Беларус. навука, 2001–2010. – Т. 1 : Магілёўскае Падняпроўе, 2001. – 797 с.
25. **Традыцыйная мастацкая культура беларусаў** : у 6 т. / Т. Б. Варфаламеева, А. М. Боганева, М. А. Козенка [і інш.]. – Мінск : Беларус. навука, 2001–2010. – Т. 2 : Віцебскае Падзвінне, 2004. – 910 с.
26. **Фальклорна-этнаграфічная і літаратурная спадчына Рэчыцкага раёна** / уклад., сістэм., тэкст. праца, уступ. арт., рэдаг. І. Ф. Штэйнера, В. С. Новак. – Мінск : ЛМФ Нёман, 2002. – 384 с.
27. **Фядосік, А. С.** Адметнасці пахавальнай і памінальнай абраднасці беларусаў / А. С. Фядосік // Сямейна-абрадавая паэзія. Народны тэатр / А. С. Фядосік [і інш.] ; рэд. К. П. Кабашнікаў. – Мінск : Беларус. навука, 2001. – С. 346–271.
28. **Чарадзейныя казкі** / рэд. В. К. Бандарчык. – Ч. І. – Мінск : Навука і тэхніка, 1973. – 648 с.
29. **Чарадзейныя казкі** / рэд. В. К. Бандарчык. – Ч. ІІ. – Мінск : Навука і тэхніка, 1978. – 696 с.
30. **Элиаде, М.** Избранные сочинения. Очерки сравнительного религиоведения / М. Элиаде ; пер. с анг. ; отв. ред. В. Я. Петрухин. – М. : Ладомир, 1999. – 488 с.


*Артыкул паступіў у рэдакцыю 30 кастрычніка 2019 г.*

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ